ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 14 (186) | Субота, 20 красавіка 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ПАЛЫМЯНЫЯ ЗАКЛІКІ

Надышла вясна вызначальнага года дзевятай пяцігодкі. Паўсюдна пануе бадзёры настрой. Наша краіна рыхтуецца ўрачыста адзначыць 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных усяго свету. Па традыцыі зноў над планетай прагучалі палымяныя Заклікі ЦК КПСС. Словы Ленінскай партыі прасякнуты рэвалюцыйным аптымізмам, глыбокай верай у невычарпальныя магчымасці савецкага народа, яго працоўны энтузіязм.

**— Працоўныя Савецкага Саюза! Актыўна змагайцеся за ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда партыі, за далейшае ўмацаванне эканамічнай і абароннай магутнасці нашай Радзімы!**

Першамайскія Заклікі натхняюць працоўных краіны на датэрміновае выкананне заданняў 1974 года, што будзе мець велізарнае значэнне не толькі для паспяховага завяршэння дзевятай пяцігодкі, але з'явіцца прыкметным крокам па шляху будаўніцтва камуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Знамянальна, што Заклікі ЦК КПСС апублікаваны перад Усесаюзным камуністычным суботнікам. Гэта выклікала ў працоўных краіны яшчэ большы прыліў сіл і энергіі. Сёння на свята працы выйдуць усе працаздольныя.

Сёлетні год будзе адзначаны ў жыцці савецкіх людзей яшчэ адной важнай падзеяй — выбарамі ў Вярхоўны Савет СССР. 16 чэрвеня выбаршчыкі аддадуць свае галасы за верных сыноў і дачок Радзімы, кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных. Наша партыя надае вялікае значэнне рабоце Саветаў дэпутатаў працоўных. І яна заклікае:

**— Грамадзяне Савецкага Саюза! Актыўна ўдзельнічайце ў маючых адбыцца выбарах у Вярхоўны Савет СССР! Выберам у Вярхоўны Савет СССР лепшых сыноў і дачок савецкага народа, дастойных прадстаўнікоў блоку камуністаў і беспартыйных!**

Як заўсёды, партыя звяртаецца і да свайго рэзерву — Ленінскага камсамола. Сёлета яе словы прагучалі ў адметны час — перад XVII з'ездам ВЛКСМ:

**— Няхай жыве Ленінскі камсамол — верны памочнік і рэзерв Камуністычнай партыі, перадавы атрад маладых будаўнікоў камунізму!**

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва адказныя задачы стаяць перад вышэйшай школай. Яна павінна рыхтаваць для народнай гаспадаркі высокакваліфікаваныя кадры. І ЦК КПСС заклікае:

**— Савецкія вучоныя і інжынерна-тэхнічныя работнікі! Рацыяналізатары і вынаходнікі! Усямерна паскарайце навукова-тэхнічны прагрэс, умацоўвайце сувязь навукі з вытворчасцю! Дабівайцеся хутчэйшага ўкаранення ў народную гаспадарку навукова-тэхнічных дасягненняў!**

Сустракаючы міжнароднае свята працоўных, савецкія людзі ганарацца той гістарычнай роляй, якую адыгрывае ленінская знешняя палітыка СССР — палітыка міру і дружбы народаў. ЦК КПСС шле гарачае прывітанне народам брацкіх сацыялістычных краін, рабочаму класу капіталістычных дзяржаў, якія самаадданна змагаюцца за свае правы, за мір, дэмакратыю і сацыялізм.

У дзень Першамайскага свята савецкія людзі яшчэ раз прадэманструюць сваю вернасць ленінскім запаветам, згуртаванасць вакол радоў Камуністычнай партыі. Над першамайскімі калонамі велічна прагучаць натхняючыя словы Заклікаў:

**— Пад сцягам марксізму-ленінізму, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі — наперад да перамогі камунізму!**

## СЁННЯ — ЎСЕСАЮЗНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК. АЗНАМЯНУЕМ ЯГО ЎДАРНАЙ ПРАЦАЙ!

### ПРАЦЯГ ВЯЛІКАГА ПАЧЫНУ

Савецкая рэчаіснасць, наша кіпучае, імклівае жыццё нараджаюць нямала выдатных традыцый. Асаблівай значнасцю вызначаюцца ленінскія камуністычныя суботнікі, якія ператвараюцца ў сапраўднае свята працы.

Першы камуністычны суботнік у нашай краіне адбыўся ў красавіку 1919 года. Яго ініцыятарамі былі рабочыя дэпо Масква-Сартавальная. Працуючы ў нерабочы час, чыгуначнікі перавысілі прадукцыйнасць працы на 270 працэнтаў. Гэта было тады нечуваным дасягненнем, і за такім прыкладам пайшлі сотні тысяч працоўных маладой Савецкай краіны.

Першыя парасткі працы па-новаму адразу ж былі прыкмечаны і высока ацэнены У. І. Леніным. Уладзімір Ільіч падкрэсліў, што «камуністычныя суботнікі маюць для нас велізарную каштоўнасць...»

Добры пачын набыў шырокі размах. Праз год, 1-га мая 1920 года, у краіне праходзіў першы Усерасійскі камуністычны суботнік, на якім працаваў асабіста і У. І. Ленін. Гэты энтузіязм, працоўны парыў соцень тысяч людзей краіны Уладзімір Ільіч трапна і вобразна назваў Вялікім пачынам.

У красавіку 1969 года гістарычнаму пачынанню споўнілася паўстагоддзя. Савецкія людзі адзначылі гэты юбілей усенародным камуністычным суботнікам. У знак глыбокай павагі да светлай памяці Уладзіміра Ільіча Леніна, які даў класічную ацэнку і вызначэнне камуністычным суботнікам і ўбачыў у іх «велізарнай важнасці прынцыповую з'яву...», арганізуецца і праводзіцца ён штогод у суботу, напярэдадні дня нараджэння У. І. Леніна — 22 красавіка.

Сёлетні камуністычны суботнік прысвечаны 104-ай гадавіне з дня нараджэння дарагога і любімага правадыра і настаўніка працоўных усяго свету. Савецкія людзі акрылены адзінай думкай, адзіным імкненнем: узняць яшчэ вышэй сцяг камуністычнага будаўніцтва, дасягнуць новых перамог на гэтым пачэсным шляху.

Сёння, калі наша газета дойдзе да чытачоў, на камуністычным суботніку будуць працаваць мільёны савецкіх людзей. Актыўны ўдзел прымуць у ім супрацоўнікі і студэнты нашага ўніверсітэта. Можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што яны азнамянуюць «чырвоную суботу» ўдарнай працай, унясуць дастойны ўклад у агульнанародную справу.

## ВЫПУСКНІКІ АТРЫМАЛІ НАКІРАВАННІ



На працягу трох дзён ля прыёмнага пакоя рэктарата ГДУ панавала ажыўленне. Яно было выклікана размеркаваннем выпускнікоў на працу. І хоць ім яшчэ засталося абараніць дыпломныя праекты і работы, здаць дзяржаўныя экзамены, але ў настроі будучых спецыялістаў ужо адчуваўся ўнутраны сум развітання з сябрамі, педагогамі. А яшчэ кожнага хвалявала адно і тое ж пытанне: куды накіруюць? Куды прывядуць цябе жыццёвыя шляхі-дарогі пасля ўніверсітэта? Як сустрэнуць цябе ў новым, працоўным калектыве?

І гэта не выпадкова. Для маладога спецыяліста першае месца работы азначае вельмі многае. У добрым калектыве лягчэй раскрыць усе свае прафесійныя і арганізатарскія здольнасці, пранікнуцца пачуццём высокай адказнасці за справу, навучыцца падыходзіць да яе па-творчаму. Таму кожнаму выпускніку хочацца атрымаць накіраванне туды, дзе ён зможа глыбей пазнаць сваю прафесію, быць найбольш карысным.

Першымі перад камісіяй па размеркаванню праходзяць людзі рамантычнай прафесіі — геолагі. Спачатку права выбару прадастаўляецца тым, хто па выніках пяці гадоў вучобы мае самы высокі бал, вызначыўся ў навукова-даследчай і грамадскай рабоце. Па ўсіх гэтых паказчыках на першым месцы стаіць на геалагічным факультэце Аляксандр Рэшатаў. Ён — выдатнік вучобы, актывіст камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, адзін з кіраўнікоў студэнцкага навуковага таварыства. Аляксандра пакідаюць працаваць ва ўніверсітэце на кафедры агульнай геалогіі.

У ліку лепшых студэнтаў факультэта значыцца і Уладзімір Шутаў. Ён дае згоду паехаць на працу ў Гродзенскі праектна-пошукавы аддзел Белгідравodгаса.

За гады сумеснай вучобы многія юнакі і дзяўчаты пакахалі адзін другога, пажаніліся. Камісія ўлічвае гэта, пасылае маладажонаў туды, дзе яны змогуць працаваць разам. У прыватнасці, Валянцін Цітавец і яго жонка Марыя будуць працаваць ва Ўпраўленні геалогіі пры Савеце Міністраў Малдаўскай ССР.

Адзін за другім праходзяць перад камісіяй па размеркаванню маладых спецыялістаў выпускнікі. Кожнаму з іх прапануецца месца працы. І мы яшчэ раз пераконваемся ў планавасці падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе нашай краіны, у перавагах сацыялістычнай сістэмы над капіталістычнай.

Геалагічны факультэт нашага ўніверсітэта пасылае свае кадры ў многія рэспублікі і вобласці Савецкага Саюза. Сёлета яго выпускнікі паедуць на працу таксама ў Латвію, Башкірыю, Новасібірск, Перм, Валгаград, Свярдлоўск, Ульянаўск, Варонеж, Курск і іншыя гарады.

Першы атрад сваіх спецыялістаў — 108 выпускнікоў — накіроўвае ў народную гаспадарку краіны эканамічны факультэт. Падрыхтаваныя ім эканамісты па працы будуць працаваць не толькі ў Беларусі, але і ў сістэме розных саюзных міністэрстваў і ведамстваў. На вытворчасці з радасцю сустрэнуць таксама маладых спецыялістаў новай кваліфікацыі — інжынераў-эканамістаў па арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

Як і ў мінулыя гады, вялікі попыт на маладых спецыялістаў, атрымаўшых вышэйшую адукацыю на механіка-матэматычным і фізічным факультэтах. Іх запрасілі да сябе завод «Гомсельмаш» і некаторыя іншыя прадпрыемствы і арганізацыі Гомеля, а таксама іншых гарадоў Беларусі. Пераважная ж большасць фізікаў і матэматыкаў атрымала накіраванні ў школы. У асноўным на ніве народнай асветы будуць працаваць выпускнікі гісторыка-філалагічнага і біялагічнага факультэтаў.

Добрае папаўненне ў атрад спецыялістаў фізічнай культуры пасылае факультэт фізічнага выхавання. Сёлета сярод яго 142 выпускнікоў — 11 майстроў і 21 кандыдат у майстры спорту, а астатнія амаль усе першаразраднікі. Найбольш вядомыя спартсмены пойдуць працаваць выкладчыкамі і трэнерамі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы. Майстры спорту Дзмітрый Курыленка, Пётр Кулікаў, Аляксандр Хатылёў і іншыя будуць працаваць на кафедрах і ў ДЮСШ ГДУ, Вячаслаў Белякоў — у Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, чэмпіёнка Еўропы па акадэмічнаму веславанню Тамара Юркова — трэнерам ДЮСШ аблана.

...Ужо недалёка той час, калі 697 выпускнікоў універсітэта атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі і набытыя ў ГДУ веды пачнуць прымяняць на практыцы.



**НА ЗДЫМКАХ: 1. На пасяджэнні камісіі па размеркаванню выпускнікоў. Будучы геолаг У. Іванцоў дае згоду паехаць на працу ў Башкірыю. 2. Выпускнікі геалагічнага факультэта В. Зайцаў, У. Торапаў, Я. Малахоўскі, В. Ісаенка, В. Хрушчоў, А. Рамарэнка.**

### У САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

Савет Міністраў СССР пастанавіў перанесці ў 1974 годзе выхадныя дні з нядзелі 5 мая на пятніцу 3 мая і з нядзелі 12 мая на пятніцу 10 мая.

**СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ**

# ЗАПРАШАЕ НА ВУЧОБУ ГІСТОРЫКА-ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ



## МАЛАДЫЯ ДАСЛЕДЧЫКІ

У цяперашні час нельга ўявіць падрыхтоўку спецыялістаў у вну без іх удзелу ў навукова-даследчай рабоце. Таму на нашым факультэце з кожным годам павялічваецца колькасць членаў навуковых гурткоў. Цяпер у іх займаецца 327 студэнтаў. Яны пішуць і абмяркоўваюць даклады, складаюць картатэкі, працуюць над слоўнікамі. Актыўны ўдзел прымаюць члены СНТ у конкурсах навуковых студэнцкіх работ.

Сёлета на рэспубліканскі тур V Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, маладзёжнаму руху і гісторыі ВЛКСМ было адпраўлена работ значна больш, чым у папярэднія гады. Даследаванні У. Коваля, Н. Сінягоўскай, У. Еўтухова, А. Маслюкова, І. Нямкевіча, Т. Кіржа, А. Елькіна журы аднесла да першай катэгорыі.

Са сваімі дакладамі студэнты факультэта рэгулярна выступаюць перад жыхарамі горада, у школах. Многія члены СНТ удзельнічаюць у міжвузаўскіх канферэнцыях.

Мы разумеем, што работа нашага студэнцкага навуковага таварыства патрабуе далейшага ўдасканальвання, магчыма, новых форм. Таму мы раім, каб будучыя першакурснікі з самага пачатку вучобы ўліваліся ў нашы рады, уносілі свежы струмень творчай думкі. Гэта дазволіць больш паспяхова авалодваць абранай спецыяльнасцю, глыбей пазнаваць нязведаныя тайны навукі.

Для тых, хто будзе выдатна вучыцца і праявіць свае здольнасці ў навукова-даследчай рабоце, заўсёды адкрыты дзверы ў аспірантуры, да выкладчыцкай працы на кафедрах універсітэта.

**Н. ДАНІЛОВІЧ,**
**старшыня СНТ факультэта.**

*ЗНАЁМЦЕСЯ СА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯМІ:*

## ГІСТАРЫЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Наша аддзяленне — равеснік універсітэта. У маі яму споўніцца пяць гадоў. Але нягледзячы на такі малады ўзрост, аддзяленне заваявала шырокую папулярнасць у моладзі. Атрымаць гістарычную адукацыю стала марай многіх юнакоў і дзяўчат, якія закончылі сярэднюю школу. Сотні абітурыентаў штогод аспрэчваюць права стаць студэнтамі - гісторыкамі.

І гэта зразумела. Гісторыя з'яўляецца навукай, вывучаючай канкрэтны ход развіцця чалавечага грамадства і яго заканамернасцей. Яна адлюстроўвае патрэбу грамадства ў самасвядомасці, у разуменні свайго сучаснага і перспектыў будучага развіцця. Без дасканалага ведання гісторыі нельга стаць перакананым барацьбітом за камунізм — светлае будучае чалавецтва.

Аддзяленне гісторыі рыхтуе навуковых супрацоўнікаў для навукова - даследчых устаноў гістарычнага профілю і выкладчыкаў гістарычных дысцыплін для вну, тэхнікумаў і сярэдніх школ. Гэтай пачэснай справай займаецца вялікі калектыў высокакваліфікаваных выкладчыкаў многіх кафедр універсітэта. Вядучае месца сярод іх займаюць кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму, філасофіі, палітэканоміі і, вядома, гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі. Апошняя —амаль самая маладая ва ўніверсітэце. Яна існуе толькі другі год. Цяпер на ёй працуюць два доктары навук, прафесары, пяць кандыдатаў навук, дацэнтаў і пяць кваліфікаваных выкладчыкаў, якія ўзбройваюць студэнтаў тэарэтычнымі ведамі па ўсіх галінах гістарычнай навукі.

У чэрвені гэтага года аддзяленне адзначыць свой першы выпуск. Чатыры яго выхаванцы ўвальюцца ў калектыў выкладчыкаў нашага ўніверсітэта, некаторыя атрымаюць пуцёўкі на далейшую вучобу ў аспірантуры іншых вну краіны, пойдуць у вялікую навуку, а пераважная ж большасць выпускнікоў папоўніць рады настаўнікаў-гісторыкаў сярэдніх школ, якія ідуць у страі правафланговых у справе камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Выкладчыкі і студэнты нашага аддзялення чакаюць новага папаўнення сваіх радоў і будуць шчыра вітаць абітурыентаў, якія пераможуць на конкурсных экзаменах гэтага года.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**загадчык кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі, дацэнт.**

## АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Аддзяленне беларускай мовы і літаратуры па праву можна назваць кузняй кадраў для сельскай школы. Выпускнікі атрымліваюць усебаковую падрыхтоўку не толькі па беларускай мове і літаратуры, але і па рускай мове і літаратуры. На пяці курсах гэтага аддзялення займаецца звыш 200 будучых спецыялістаў. Кафедра рускай і беларускай мовы, кафедры рускай і беларускай літаратур, дзе працуюць два доктары філалагічных навук, пятнаццаць дацэнтаў і кандыдатаў, дапамагаюць студэнтам авалодаць не толькі сучаснымі курсамі, а і па гісторыі моў і літаратур, па фальклору і дыялекталогіі. Студэнты неаднаразова выязджаюць у вёскі на практыкі і прывозяць цікавыя творы вуснай народнай творчасці, багатыя матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны.

На аддзяленні працуюць навуковыя студэнцкія гурткі, у якіх займаюцца аматары роднага слова. З навуковымі дакладамі, даследаваннямі нашы студэнты выходзяць на рэспубліканскія конкурсы, навуковыя студэнцкія канферэнцыі ў Беларусі і за яе межамі. Захапленне навуковымі даследаваннямі для многіх выпускнікоў аддзялення стала асноўным у жыцці. Выкладчыкамі працуюць былыя выпускнікі кандыдаты філалагічных навук Гарленка Вольга Аляксееўна, Смыкоўская Валянціна Іванаўна, а таксама Беліч Уладзімір Леанідавіч, Мельнікава Людміла Васільеўна і іншыя.

Не адрываюцца студэнты і ад школы. Апрача педагагічных практык, працы ў піянерскіх лагерах, амаль усе яны працуюць важатымі ў гарадскіх школах, вядуць работу ў дзіцячым пакоі міліцыі, у домакіраўніцтвах.

За гады існавання ўніверсітэта аддзяленне закончылі каля ста чалавек, атрымаўшы правы выкладання беларускай і рускай мовы і літаратуры. Сёння нашага выпускніка можна сустрэць ледзь не ў кожным раёне. Настаўнікамі працуюць у Светлагорскім раёне Парашчанка Ліда, Філіпчык Аляксандр, Кірычэнка Валя, у Рэчыцкім — Грабоўская Дуся, Кашпур Жора, у Хойніцкім — Лапотка Люба, Дашкевіч Ніна і г. д.

Сярод выпускнікоў беларускага аддзялення можна назваць і не адно імя паэта і празаіка. У свой час займаліся тут Мікола Сурначоў, Іван Шамякін, маладая паэтэса Ніна Шклярава.

Мы заўсёды рады і гасцінна запрашаем усіх, хто любіць родную мову, паступаць на наша аддзяленне.

**З. РУДАКОЎСКАЯ,**
**старшы выкладчык кафедры рускай і беларускай моў.**

## АДДЗЯЛЕННЕ РУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Многія юнакі і дзяўчаты ўжо за школьнай партай праяўляюць вялікую любоў да рускай мовы і літаратуры, папулярнасць якіх з кожным годам расце ва ўсім свеце. І гэта заканамерна. Руская мова — мова першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, на ёй размаўляў правадыр і настаўнік працоўных нашай планеты Уладзімір Ільіч Ленін, на ёй стваралі свае творы шырока вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі майстры слова.

Таму не выпадкова кожны год шмат жадаючых паступіць на аддзяленне рускай мовы і літаратуры нашага ўніверсітэта. Яно разам з беларускім аддзяленнем як бы стварае культурнае аблічча ГДУ: без удзелу філолагаў не абыходзіцца ні адно больш—менш значнае мерапрыемства.

Вучэбны працэс на рускім аддзяленні такі ж, як і на беларускім. Перавага аддаецца толькі спецыяльным дысцыплінам. Выкладанне вядуць выкладчыкі адных і тых жа кафедр. Словам, калектывы абодвух аддзяленняў жывуць і працуюць адной дружнай сям'ёй, сумесна вырашаюць многія задачы.

На нашых аддзяленнях пад кіраўніцтвам загадчыкаў кафедр, прафесараў У. В. Анічэнкі і М. М. Грынчыка створаны сур'ёзныя навуковыя цэнтры. Толькі за апошнія два гады па важных праблемах філалогіі здадзена ў друк некалькі манаграфій, слоўнікі, выдадзен шэраг тэматычных зборнікаў з навуковымі працамі і г. д. У нас праводзяцца рэспубліканскія і абласныя навуковыя канферэнцыі, кафедры падтрымліваюць цесныя сувязі з многімі ўстановамі і творчымі саюзамі СССР і сацыялістычных краін.

Выпускнікі аддзялення атрымоўваюць кваліфікацыю філолага з правам выкладання рускай мовы і літаратуры. Універсітэцкая адукацыя дае ім права працаваць не толькі ў школах, але і ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных і даследчых установах.

**У. САБАЛЕНКА,**
**в. а. загадчыка кафедры рускай літаратуры, кандыдат філалагічных навук.**



**Купалаўскую стыпендыятку Людмілу Несцярок добра ведаюць студэнты гісторыка - філалагічнага факультэта. Яшчэ на падрыхтоўчым аддзяленні праявіліся яе здольнасці ў вучобе і грамадскай дзейнасці.**

**Сціплую дзяўчыну з Брагіна заўважылі, выбралі ў камсамольскае бюро факультэта. Людміла пачала ўзначальваць шэфскі сектар. Карысная работа і цікавыя мерапрыемствы былі праведзены пад яе кіраўніцтвам шэфамі-студэнтамі ў многіх школах Гомеля.**

**Актыўнасцю вызначаецца выдатніца вучобы і ў навуковай працы. Яе даследаванне па беларускай літаратуры аднесена да другой катэгорыі.**

**Людмілу цікавіць не толькі выбраная спецыяльнасць, яна захапляецца і філасофіяй. Нядаўна навуковая работа Л. Л. Несцярок па гэтай дысцыпліне таксама была аднесена да другой катэгорыі.**

**На здымку: купалаўская стыпендыятка, студэнтка трэцяга курса гісторыка-філалагічнага факультэта Л. Л. Несцярок.**

## У ВОЛЬНЫ АД ВУЧОБЫ ЧАС

Калі размова заходзіць пра мастацкую самадзейнасць, мне нагадваецца першы конкурсны вечар гісторыка-філалагічнага факультэта, які адбыўся каля чатырох гадоў таму назад. Наш факультэт заняў тады першае месца. У гэтым была немалая заслуга харавога калектыву, якім кіруе Валерый Шчарбін. Цёпла ўспрымалі гледачы і выступленні эстраднага аркестра, спявачак Тамару Пётух і Таццяну Шчэрбу.

Гэта было пачаткам. За мінулы час аматары мастацкай самадзейнасці нашага факультэта неаднаразова выходзілі пераможцамі на конкурсных вечарах. З вялікім задавальненнем іх сустракаюць і працаўнікі вёскі.

Смех і весялосць нязменна спадарожнічаюць выступленням удзельнікаў студэнцкага тэатра мініяцюр. У маленькіх сцэнках са студэнцкага жыцця, якімі багаты рэпертуар, многія пазнаюць сябе. А гэта заўсёды рассмешвае.

Вялікім поспехам у гледачоў карыстаецца вакальна-інструментальны ансамбль «Радзімічы», які быў створаны ў 1972 годзе студэнтамі нашага факультэта і факультэта фізвыхавання. За два з лішнім гады работы самадзейны ансамбль даў каля ста канцэртаў. Ён пабываў ва ўсіх раёнах Гомельшчыны, выступаў перад працаўнікамі Украіны і сонечнай Малдавіі, выязджаў на гастролі ў Чэхаславакію.

За апошні час у рэпертуары ансамбля з'явілася шмат новых твораў, пераважна беларускіх народных песняў. Ствараюць іх і самі ўдзельнікі ансамбля, нашы студэнты.

**С. БЯЛОЎ,**
**студэнт V-га курса, кіраўнік вакальна-інструментальнага ансамбля «Радзімічы».**



**НА ЗДЫМКУ:** ідзе пасяджэнне літаратуразнаўчага навуковага гуртка. Пад кіраўніцтвам кандыдата філалагічных навук, дацэнта М. А. Маляўкі гуртокоўцы праводзяць цікавыя даследаванні.

Фота А. Рудчанка.

ПРАЦЯГВАЕМ ДЫСКУСІЮ: ІНТЭРНАТ—ТВОЙ ДОМ

# А ПРАБЛЕМ НЕ МЕНШАЕ

Сапраўды: інтэрнат — твой дом. Нават больш гэтага. Ва ўласным доме шмат няма таго, што ёсць тут. Акрамя дзяржаўных сцен, мэблі, пасцелей, мы маем абслугоўваючы персанал, добра абстаўленыя холы. Для студэнтаў, пражываючых у інтэрнаце, чытаюцца лекцыі на разнастайныя тэмы. І нельга згадзіцца з думкай тых, хто сцвярджае, што этычныя гутаркі, палітінфармацыі і іншыя культурна-масавыя мерапрыемствы не задавальняюць большасці студэнтаў. Тэматыка ж гэтых мерапрыемстваў вызначаецца самімі студэнтамі. Чым большага і лепшага яны будуць патрабаваць, тым хутчэй задаволяць свае патрэбы. Напэўна, таму паспяхова праведзенае мерапрыемства — паказчык ініцыятывы, інтарэсаў перш за ўсё самix студэнтаў. Гэта і крытэрый ацэнкі работы студэнцкага савета.

На самай справе, нельга сказаць, што ў нашым інтэрнаце зусім не чуваць голасу студсавета. Але недахопы ў яго рабоце ёсць. Пакуль што дрэнная каардынацыя дзейнняў студсавета і каменданта. У значным паляпшэнні работы савета і каменданта патрабуецца зрабіць вельмі і вельмі многае.

На вялікі жаль у інтэрнаце маюць месца парушэнні правіл сацыялістычнага агульнажыцця з боку нас саміх — студэнтаў. На трэцім паверсе лічыцца дапушчальным, на думку аматараў, гульня ў даміно ў холе. І гэтыя таварышы не задумваюцца над тым, што яны перашкаджаюць нармальнай працы, сну студэнтаў у суседніх з холам пакоях. Курэнне ў холе таксама звычайная з'ява. Ёсць студэнты, якія часта ходзяць па паверху ў п'яным стане. За іх трэба ўзяцца не толькі студсавету, але і каменданту.

Толькі пасля навядзення парадку ў гэтай справе трэба брацца за іншае, за большае.

**Л. МАШЭЎСКІ,**
**староста трэцяга паверха інтэрната № 2.**

# ПЕРШЫНСТВО ГІМНАСТАЎ



Святам прыгажосці можна назваць выступленні гімнастаў. Два дні яны аспрэчвалі перамогу ў спаборніцтвах па праграме круглагадовай універсіяды. 75 мацнейшых гімнастаў універсітэта ў вялікай спартыўнай зале паказвалі сваё майстэрства.

У сябе дома гімнасты яшчэ раз паказалі ўзрослае майстэрства, выявілі новую таленавітую моладзь.

На працягу ўсёй вучобы Людміла Дварэцкая абараняла гонар універсітэта на розных спаборніцтвах. І на гэты раз неаднаразовая прызёрка студэнцкага таварыства «Буравеснік» па спартыўнай гімнастыцы, паказаўшы выдатны вынік 74,2 балы, заняла першае месца сярод майстроў спорту. У гэтым годзе Люда заканчвае універсітэт і паедзе на працу ў Бранск. Верыцца, што і там яна не пакіне гімнастычны памост.

Яе сяброўка, студэнтка факультэта фізвыхавання Л. Зянькевіч заняла другое месца. Сярод юнакоў перамог студэнт эканамічнага факультэта майстар спорту Б. Міхайлаў. Па праграме кандытаў у майстры спорту добра выступіў студэнт факультэта фізвыхавання С. Барбурцян. Сярод першаразрадніц мацнейшай была студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта Ж. Тачоная.

Пераможцы спаборніцтваў узнагароджаны граматамі спартыўнага клуба ўніверсітэта.

**А. АЛЕСЕЎ.**

**НА ЗДЫМКУ: трэнер Т. К. Дубовік (у цэнтры) са сваімі выхаванцамі (злева направа) Л. Зянькевіч, Н. Сотнікава, Н. Волкава, Л. Дварэцкая.**

*Літаратурны каляндар*

# ПЯСНЯР СВАБОДЫ

### ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ ДЖ. БАЙРАНА

У шарэнзе вялікіх дзеячоў літаратуры і мастацтва Дж. Байрану (1788—1824), гэтаму «Праметэю XIX ст.» (Бялінскі), належыць адно з самых ганаровых месц.

Па праву ён адчуваў сябе ў сваёй творчасці барацьбітом і параўноўваў свае творы з праслаўленымі ў гісторыі бітвамі:

Моей Москвою будет «Дон-Жуан»,
Как Лейпцигом, пожалуй, был «Фальеро»,
А «Каин»—это просто Мон-Сен-Жан.

Іранічная інтанацыя гэтых радкоў песні адзінаццатай «Дон-Жуана» не супярэчыць глыбокай сур'ёзнасці выражанага ў іх пабуджэння.

Прыпадабненне палітычнага верша — ручной гранаце, слова — маланцы, думкі — мечу, свайго паэтычнага голаса — легендарнаму Раландаву рогу, які кліча ў бой, праходзіць праз усю творчасць Байрана.

Выхадзец з старадаўняй арыстакратычнай сям'і, Байран парваў з радавітай англійскай знаццю і звязаў сваё жыццё з нацыянальна-вызваленчым і рэвалюцыйным рухам.

Асоба ў вышэйшай ступені актыўная, да таго ж валодаючая здольнасцю думаць гістарычна, Байран востра адчуваў сябе чалавекам пераломнай рэвалюцыйнай эпохі і шкадаваў, што нарадзіўся надта позна, каб прыняць удзел у рэвалюцыйных баях канца XVIII стагоддзя.

Яго глыбока абурала роля «турэмшчыка народаў», якую прыняла на сябе Англія, патапіўшая ў крыві ірландскія нацыянальна-вызваленчыя паўстанні 1798 і 1803 гадоў, зарабаваўшая і разграбіўшая Індыю, спрыяючая рэстаўрацыі рэакцыйных урадаў у Еўропе пасля падзення Напалеона.

Ужо ў першым паэтычным зборніку «Гадзіны адпачынку» (1807) гучыць незадаволенасць юнага паэта англійскай буржуазнай рэчаіснасцю. Вершы гэтага зборніка былі адмоўна ацэнены ліберальнай крытыкай, на што Байран адказаў знішчальнай сатырай «Англійскія барды і шатландскія аглядальнікі» (1809). Гэта сатыра з'явілася таксама першым літаратурным і палітычным маніфестам рэвалюцыйнага англійскага рамантызму. Байран падвяргае ў ёй злоснаму высмейванню рэакцыйных рамантыкаў — Саўці, Вордсварта, Кальрыджа, супрацьпастаўляе ім свой ідэал паэта, паэта-барацьбіта, чый грамадзянскі абавязак — стаць «бліжэй да жыцця» і абараніць ад зла дабро:

Когда поэта встречу я,
Который... с душою редкой
Соединит талант к сатире едкой
И станет защищать от зла добро,
Тогда своё я положу перо.

Першае працяглае падарожжа Байрана за мяжу, дзе ён правёў каля двух гадоў (1809—1811), галоўным чынам у краінах Блізкага Усходу, было само па сабе дэманстрацыйным актам выкліку, ён пакінуў Англію ў разгар яе ваенных дзеянняў супраць Напалеона, ледзь паспеўшы афіцыйна заняць сваё месца ў парламенце. Гэта падарожжа абагаціла ўражанні паэта, адлюстравалася ў першых песнях «Паломніцтва Чайльд-Гарольда» (1812) і абвастрыла крытычныя адносіны маладога паэта да палітыкі правячых колаў яго радзімы. «Я праехаў праз Пірынейскі паўвостраў у дні, калі там лютавала вайна, я пабыў у самых прыгнечаных правінцыях Турцыі, але нават там, пад уладай дэспатычнага і нехрысцянскага ўрада, я не бачыў такой жудаснай галечы, якую пасля свайго вяртання знайшоў тут, у самым сэрцы хрысціянскай дзяржавы...» — так характарызаваў Байран становішча англійскіх рабочых у сваім першым выступленні ў парламенце (люты 1812 г.). Размова ішла пра землякоў, рабочых-панчошнікаў, якія бунтавалі, захоплівалі фабрыкі і разбуралі выціснуўшыя іх з вытворчасці станкі. Даведзеныя да крайняй ступені галечы і адчаю, не разумеючы, што віноўнікам іх бедстваў з'яўляецца капіталістычны лад, англійскія рабочыя-луддзіты (ад імя легендарнага рабочага Неда Лудда) накіроўвалі ўвесь свой гнеў супраць машын, якія замянілі ручную працу.

Урад спяшаўся правесці праз парламент законапраект аб смяротнай кары для бунтаўшчыкоў, супраць бесчалавечнасці якога выступіў Байран. Але яго абарона луддзітаў-разбуральнікаў станкоў не дасягнула мэты. Біль быў зацверджан парламентам. У адказ на гэта Байран апублікаваў верш «Ода аўтарам біля супраць разбуральнікаў станкоў», у якім прама і рэзка крытыкавалася капіталістычнае грамадства.

Другое выступленне Байрана ў парламенце было накіравана на абарону нацыянальнай незалежнасці ірландскага народа. Але і яно не дало станоўчых вынікаў. Таму Байран назаўсёды адыходзіць ад удзелу ў парламенцкай барацьбе. Рэакцыянеры шукаюць спробы для расправы з паэтам, і ён вымушаны ў 1816 годзе назаўсёды пакінуць сваю радзіму. Спачатку ён жыве ў Швейцарыі, а затым—у Італіі, дзе прымае актыўны ўдзел у руху італьянскіх патрыётаў-карбанарыяў.

У Італіі Байран заканчвае сваю ліра-эпічную паэму «Паломніцтва Чайльд-Гарольда».

Гарольд — роданачальнік многіх рамантычных герояў. Падабенства на яго мае і Яўген Анегін. А. С. Пушкін зазначаў:

Как Чайльд-Гарольд, угрюмый и томимый,
В гостинных появлялся он.

Больш актыўнага, мэтанакіравачага героя-бунтаўшчыка Байран стварыў у цыкле «ўсходніх паэм» (1813—1816).

У швейцарскі перыяд свайго жыцця паэт усведамляе слабасць свайго ранняга ідэала, імкненні якога былі эгаістычнымі, а мэта — заваяванне свабоды—дарэмнай. У паэме «Шыльёнскі вязень» паўстае вобраз палітычнага барацьбіта, нацыянальнага героя.

З-пад пяра таленавітага аўтара выходзіць яшчэ шэраг значных твораў. Найбольш буйным з іх з'яўляецца раман у вершах «Дон-Жуан», які вядомы самаму шырокаму колу чытачоў.

Жыццё Байрана абарвалася вельмі рана. Ён памёр ад цяжкай хваробы 19 красавіка 1824 года. Яго смерць была адзначана ў Грэцыі, дзе ён жыў у апошні час, нацыянальнай жалобай. Па просьбе грэчаскіх патрыётаў сэрца Байрана пахавалі ў Грэцыі, а цела адправілі ў Англію.

У сэрцах перадавых людзей смерць Байрана адклікнулася вялікім смуткам. Яго памяці прысвяцілі свае вершы К. Ф. Рылееў, А. С. Пушкін і многія іншыя карыфеі літаратуры. У прыватнасці, А. С. Пушкін піcаў:

Исчез, оплаканный свободой,
Оставя миру свой венец,
Шуми, волнуйся непогодой:
Он был, о море, твой певец.
Твой образ был на нём означен,
Он духом создан был твоим:
Как ты, могущ, глубок и мрачен,
Как ты, никем неукротим.

Паэзія Байрана аказала вялікі ўплыў на ўсю сусветную літаратуру. Пушкін, Лермантаў, Гюго, Гётэ, Гейнэ, Міцкевіч і многія іншыя еўрапейскія класікі чэрпалі новае натхненне ў страсных свабодалюбівых творах Байрана і творча асвойвалі яго мастацкае наватарства.

У нашай краіне Байрана любяць і цэняць. Яго творы выдаюцца вялікімі тыражамі не толькі на рускай, але і на іншых мовах народаў СССР. У прыватнасці, у 1963 годзе выдадзен зборнік выбраных твораў Байрана ў перакладах беларускіх паэтаў.

Зараз, праз 150 год з дня смерці Дж. Байрана, мы нізка схіляем галавы ў знак яго светлай памяці.

**В. ГРОМАВА,**
**выкладчык кафедры рускай літаратуры.**

*Для цікаўных*

## ГАРАНТЫЯ — СТО ГАДОЎ

Гадзіннікавая вежа, якая ўзвышаецца ў цэнтры невялікага горада Банска ў Благоеўградскай акрузе Балгарыі, па праву лічыцца адной з мясцовых выдатнасцей. Яна пабудавана 128 гадоў назад і мае значную вышыню — 30 метраў. У 1866 годзе ў ёй быў установлены гадзіннік, сканструяваны балгарскім майстрам-самавучкам Т. Радонавым. З таго часу жыхары Банска правяраюць па ім дакладны час — за гэтыя гады гадзіннік ні разу не рамантаваўся і працуе бездакорна.

## ДЗЕ ЖЫВЕ ПАН КАВАЛЬСКІ?

Сталіца Польшчы Варшава налічвае 1.390 тысяч жыхароў. Сярод іх пражывае 7 тысяч Кавальскіх, 4 тысячы Янкоўскіх, крыху менш Дамброўскіх, Зялінскіх і Квяткоўскіх. Як знайсці аднаго з 7 тысяч Кавальскіх? Бо штогод такая ж колькасць людзей мяняе сваё месца пражывання.

На адной з вуліц Варшавы ёсць адраснае бюро, у архівах якога сканцэнтравана 3 мільёны картак з данымі на ўсіх жыхароў польскай сталіцы. Чаму 3 мільёны? Вельмі проста. Выходзіць, напрыклад, Агнешка замуж і мяняе прозвішча. На яе заводзіцца другая картка. Акрамя таго, на працягу доўгага часу ў бюро захоўваюцца карткі на памёршых з указаннем даты і месца смерці.

## ДАЦКІЯ БЛІЗНЯТЫ Ў ГАСЦЯХ

Незвычайная сустрэча адбылася нядаўна ў польскім горадзе Гданьску. У госці да пяці блізнят Леакадзіі і Браніслава Рыхерт прыбылі іх «калегі» з Даніі — чатыры хлопчыкі, дзеці Лейфа і Гісер Хансен.

Нягледзячы на розніцу ў мове і ўзросце — дацкім блізнятам па шэсць гадоў, а маленькім Рыхертам толькі ў маі споўніцца тры гады, — яны хутка пасябравалі.

Дзеці разам гулялі, хадзілі на прагулку ў заснежаны парк, гулялі па вуліцах Гданьска.

## ПЕРШЫ ЭЛЕКТРАМАБІЛЬ У ГДР

Каля дваццаці тысяч кіламетраў прайшоў па дарогах рэспублікі першы ў ГДР легкавы аўтамабіль з электраматорам. Гэта аўтамашына, пераабсталяваная з серыйнай малалітражкі «Трабант» супрацоўнікам Дрэздэнскага транспартнага інстытута, можа рухацца са скорасцю 30—40 кіламетраў у гадзіну.

## СКУЛЬПТУРЫ XIV СТАГОДДЗЯ

Нядаўна венгерскія археолагі выявілі ў ходзе аднаўленчых работ у Будайскай крэпасці вялікія «могілкі» скульптур XIV стагоддзя. Пакуль што дасталі на паверхню толькі 16 работ размерам да паўтара метра. Яны адлюстроўваюць людзей у рыцарскіх даспехах.

Сучасныя мастацтвазнаўцы па пісьмовых крыніцах ведалі, што ў XIV і XV стагоддзях у Будзе працвітала мастацтва скульптуры, але лічылася, што творы тых майстроў страчаны. Археолагі ўпэўнены, што пры далейшых раскопках удасца выявіць вялікую колькасць гэтых каштоўных твораў мастацтва.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

Рэктарат, партком, мясцком, дэканат факультэта фізвыхавання і кафедра тэарэтычных асноў фізвыхавання і плавання выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры, дацэнту ВОЛКАВУ Ігару Пятровічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.

АЗ 04249 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Паласдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш, Фармат 300×420 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 2960